***Жыру́юць*** — кормяцца, нагульваюць тлушч (*рус.* жир).



## ПАЎЛЮК ПРАНУЗА

## Сёння ў Толі выхадны

Сёння ў Толі выхадны,
Дома не сядзіцца.
Вынес раніцай зярнят
Снегірам, сініцам.

На кустах і пад акном
Новыя кармушкі,
Да вячэрняе зары
Тут жыруюць птушкі.

Ноччу снегу намяло,
Гу́рбы на дарозе.
Вось на вуліцы гудзе
Працаўнік-бульдозер.

На марозе ж не стаяць!
Толя ўзяў лапату.
Снег рыпучы разграбаў
Радасна, заўзята.

Разагрэўся, успацеў,
Рукавіцы скінуў.





Правообладатель Национальный институт образования

Ад пад’езда цераз двор
Пралягла сцяжына.

Хто ні крочыў, гаварыў:
— Малайчына, Толя…
Снег сцяжынку не замёў,
Церусіў паволі.

1. Якія добрыя справы зрабіў Толя ў свой выхадны дзень? Прачытайце.
2. Ці лёгка было хлопчыку разграбаць снег? Падмацуйце сваю думку радкамі з верша.
3. За што хвалілі людзі галоўнага героя?
4. Ці можна сказаць, што ў Толі залатое сэрца? Пра якіх людзей так звычайна гавораць?
5. Які сэнс уклаў аўтар у радкі:

   Снег сцяжынку не замёў,
   Церусіў паволі?

6. Вызначце тэму і асноўную думку твора.
7. Якія прыказкі падыходзяць да сэнсу гэтага твора?
8. Які эпізод з твора праілюстраваны? Прачытайце адпаведныя радкі.
9. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша. З якім настроем і інтанацыяй трэба чытаць твор? Чаму?

**Давайце абмяркуем.** Якія карысныя справы зрабілі ці робіце вы? Раскажыце пра іх.


Правообладатель Национальный институт образования

**Маўленчая размінка.** Вывучыце лічылку. З дапамогай яе пералічыце сваіх аднакласнікаў. Вымаўляйце правільна гукі [дз’], [ч], [г], [р], [ц’].

## ЛІЧЫЛКА

Раз, два, тры —
Бяжым з гары.
Чатыры, пяць —
Спрабуй дагнаць.

Шэсць, сем, восем —
Бегчы просім.
Дзевяць, дзесяць —
Хто нас стрэціць.

*Ніна Галіноўская.*




***Навы́перадкі*** — стараючыся перагнаць адзін аднаго.
***Арэ́лі*** — гушкалка.
***Руды́*** — рыжа-карычневы.

## ЛІДЗІЯ АРАБЕЙ

## Добрая фея

Свяціла сонейка, зелянела трава, клёнікі толькі што павыкідалі свае клейкія лісточкі. І весела забаўляліся ў двары хлопчыкі. Яны бегалі навыперадкі, гулялі ў хованкі, гу́шкаліся на арэлях. З імі бегаў, залівіста гаўкаў руды́ віславухі сабачка, ён не баяўся, што яго пакрыўдзяць альбо прагоняць, бо ведаў — ён з гэтай самай кампаніі і дзеці яго любяць.



Правообладатель Национальный институт образования